МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Установа адукацыі
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар, прафесар
І.М.Мароз
27.06.2023
Рэг. № УД-07038/2324/вуч.

Контрольный экземпляр

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (У КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)

**Вучэбная праграма ўстановы адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

**7-07-0911-01 «Лячэбная справа»;**
**7-07-0911-02 «Медыка-прафілактычная справа»;**
**7-07-0911-03 «Стаматалогія»;**
**7-07-0911-06 «Педыятрыя»;**
**7-07- 0912-01 «Фармацыя»**

2023

Вучэбная праграма складзена на падставе тыпавой праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі, зацверджаннай 14.12.2022, рэгістрацыйны № ТД-СГ.038/тып., вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-01 "Лячэбная справа", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-01/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-02 "Медыка-прафілактычная справа", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-02/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-03 "Стаматалогія", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-03/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-06 "Педыятрыя", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-06/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0912-01 "Фармацыя", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0912-01/2324

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Н.А. Поляк, дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускідзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай філасофіі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»(пратакол № 14 ад 25.05.2023);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»(пратакол № 6 ад 27.06.2023)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» – вучэбная дысцыпліна сацыяльна-гуманітарнага модуля, якая ўтрымлівае сістэматызаваныя навуковыя веды аб асаблівасцях і агульных заканамернасцях гістарычнага развіцця Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайны.

Мэтай вывучэння вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне грамадска-палітычнага светапогляду студэнтаў, які будзе садзейнічаць іх самавызначэнню ў працэсе паглыбленага асэнсавання подзвігу савецкага народа і геапалітычных урокаў Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, захаванню і ўмацаванню гістарычнай памяці аб ролі Савецкага Саюза і краін антыгітлераўскай кааліцыі ў Перамозе над германскім нацызмам, трансляцыі гістарычнай праўды і норм паводзін, каштоўнасцей і традыцый, выпрацаваных беларускім народам у перыяд пераадолення трагічных ваенных падзей.

Для рэалізацыі абазначанай вышэй мэты задачамі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» вызначаны наступныя:

фарміраванне ў студэнтаў грамадзянскіх і патрыятычных якасцей асобы;

выхаванне ў студэнцкай моладзі пачуцця адказнасці за будучыню сваёй дзяржавы і сусветнага супольніцтва;

фарміраванне ў студэнтаў ведаў аб гераічных і трагічных уроках Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, паўсядзённым жыцці насельніцтва на акупаванай тэрыторыі і ў савецкім тыле, укладзе прадстаўнікоў шматнацыянальнага народа Беларусі ў разгром германскіх захопнікаў, уплыве ваенных падзей на лёсы народаў Савецкага Саюза і Еўропы.

Веды, уменні і навыкі атрыманныя пры вывучэнні дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», неабходныя для паспяховага вывучэння наступных дысцыплін: «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».

Студэнт, які засвоіў змест вучэбнага матэрыялу вучэбнай дысцыпліны, павінен валодаць наступнай светапогляднай і грамадзянска-палітычнай кампетэнцыяй:

валодаць здольнасцю фармуляваць асабістыя светапоглядныя прынцыпы на аснове подзвіга беларускага народа і гістарычных урокаў Вялікай Айчыннай вайны, захоўваць і памнажаць гістарычную памяць аб ролі Савецкага саюза і яго народаў у Перамозе над германскім нацызмам, ажыццяўляць трансляцыю новым пакаленням гістарычнай праўды і норм паводзін, каштоўнасцей і традыцый, выпрацаваных беларускім народам у перыяд трагічных падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Па выніках вывучэння навукова-тэарэтычнага зместу студэнты павінны **ведаць**:

асноўныя перыяды Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў і іх змест;

сутнасць акупацыйнай палітыкі германскіх улад;

месца і ролю Беларусі ў геапалітычных працэсах у міжваенны перыяд і ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

прыклады гераізму, мужнасці, самаахвярнасці абаронцаў Радзімы – воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў, удзельнікаў руху Супраціўлення і вайсковых фарміраванняў саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі;

уклад беларускага народа ў Перамогу над нацызмам і яе гістарычнае значэнне;

розныя пункты гледжання на праблемныя пытанні ў асвятленні падзей і вынікі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

**умець**:

характарызаваць становішча беларускага народа і яго ролю ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў у розныя перыяды Вялікай Айчыннай вайны;

раскрываць чалавеканенавісніцкі характар германскай акупацыйнай палітыкі;

ушаноўваць памяць пра подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

супрацьстаяць фальсіфікацыям ў асвятленні падзей і вынікаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, прыводзіць аргументы і выказваць асабісты пункт гледжання;

характарызаваць эвалюцыю геапалітычнага становішча беларускай дзяржавы ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

вызначаць крыніцы і ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народа;

ушаноўваць памяць пра подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**авалодаць**:

навукова-тэарэтычнымі ведамі, неабходнымі для сацыялізацыі асобы студэнта (вырашэння сацыяльна-асабістых задач);

практыка-арыентаванымі ўменнямі, звязанымі з канкрэтнай спецыяльнасцю, па якой арганізуецца навучанне студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

У рамках адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарытычныя веды, але і развіць свой каштоўнасна-асабовы патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатоўнасць да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым і сацыяльна-культурным жыцці краіны.

**Усяго** на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца 72 акадэмічныя гадзіны. Размеркаванне аўдыторных гадзін па відам заняткаў: 18 гадзін лекцый (у тым ліку 6 гадзін кіруемай самастойнай працы (КСП)), 18 гадзін семінараў, 32 гадзіны самастойнай працы студэнта.

Для студэнтаў завочнай формы навучання: 4 гадзіны лекцый, 4 гадзіны семінарскіх заняткаў, 64 гадзіны самастойнай працы.

Атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме дыферэнцыраванага заліку .

Форма атрымання адукацыі – вочная дзённая, завочна

# РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЭТУ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ ПА СЕМЕСТРАМ

| Код, назва спецыяльнасці | Семестр | Колькасцьгадзін вучэбных заняткаў | | | | | | Форма атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | аўдыторных | з іх | | | самастойных пазааўдыторных | |
| | | | | лекцый (у тым ліку КСП) | КСП | семінараў | | |
| 7-07-0911 01 «Лячэбная справа» | 2 | 72 | 34 | 18 | 6 | 18 | 38 | дыферэнцыраваны залік |
| 7-07-0911-02 «Медыка-прафілактычная справа» | 2 | 72 | 34 | 18 | 6 | 18 | 38 | дыферэнцыраваны залік |
| 7-07-0911-03 «Стаматалогія» | 2 | 72 | 34 | 18 | 6 | 18 | 38 | дыферэнцыраваны залік |
| 7-07- 0911-06 «Педыятрыя» | 2 | 72 | 34 | 18 | 6 | 18 | 38 | дыферэнцыраваны залік |
| 7-07-0912-01 «Фармацыя» (вочная форма навучання) | 2 | 72 | 34 | 18 | 6 | 18 | 38 | дыферэнцыраваны залік |
| 7-07-0912 01 «Фармацыя» (завочная форма навучання) | 2 | 72 | 8 | 4 | | 4 | 64 | дыферэнцыраваны залік |

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## (ВОЧНАЯ ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Назва раздзела (тэмы) | Колькасцьгадзін аўдыторных заняткаў | |
|---|---|---|
| | лекцый | семінараў |
| **1. Савецкі Саюз і краіны свету напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны** | **6** | **4** |
| 1.1. Уводзіны ў дысцыпліну. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны | 2 | 1 |
| 1.2. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі | 2 | 1 |
| 1.3. Акупацыя Германіяй краін Еўропы | 1 | 1 |
| 1.4. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны | 1 | 1 |
| **2. Барацьба савецкага народа супрацьгерманскай агрэсіі** | **6** | **8** |
| 2.1. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны | 2 | 2 |
| 2.2. Акупацыйны рэжым | 2 | 4 |
| 2.3. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі | 2 | 2 |
| **3. Разгром фашысцкага блока. Завяршэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў** | **6** | **6** |
| 3.1. Падзеі на франтах вайны. Крах наступальнай стратэгіі германскага вермахта | 2 | 1 |
| 3.2. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў | 2 | 1 |
| 3.3. Савецкі тыл у гады вайны. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Перамога! Ушанаванне памяці загінуўшых у Беларусі | 2 | 4 |
| ***Усяго гадзін*** | **18** | **18** |

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Назва раздзела (тэмы) | Колькасць гадзін аўдыторных заняткаў | | Самастойная работа |
|---|---|---|---|
| | лекцый | семінараў | |
| **1.Савецкі Саюз і краіны свету напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны** | **2** | **1** | **22** |
| 1.1. Уводзіны ў дысцыпліну. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны | 1 | | 4 |
| 1.2. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі | 1 | | 6 |
| 1.3. Акупацыя Германіяй краін Еўропы | | | 6 |
| 1.4. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны | | 1 | 6 |
| **2. Барацьба савецкага народа супраць германскай агрэсіі** | **1** | **3** | **18** |
| 2.1.Пачатак Вялікай Айчыннай вайны | 1 | 1 | 6 |
| 2.2. Акупацыйны рэжым | | 1 | 6 |
| 2.3. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі | | 1 | 6 |
| **3. Разгром фашысцкага блока. Завяршэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў** | **1** | | **24** |
| 3.1 Падзеі на франтах вайны. Крах наступальнай стратэгіі германскага вермахта | | | 6 |
| 3.2. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў | 1 | | 6 |
| 3.3. Савецкі тыл у гады вайны. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Перамога!Ушанаванне памяці загінуўшых у Беларусі | | | 12 |
| ***Усяго гадзін*** | **4** | **4** | **64** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

## 1. САВЕЦКІ САЮЗ І КРАІНЫ СВЕТУ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

### 1.1. Уводзіны ў дысцыпліну

Прадмет, мэты і задачы дысцыпліны, яе структура і змест. Актуальнасць вывучэння гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Навуковыя плыні і гістарычныя школы. Перыядызацыя Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Гістарыяграфія і крыніцы.

Перамога над германскім нацызмам у Другой сусветнай вайне. Гістарычная памяць аб Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

### 1.2. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны

Міжнародная дзейнасць Германіі ў 1930-я гг. Ачагі ваеннай напружанасці (Далёкі Усход, Еўропа, Афрыка). Фарміраванне фашысцкага блока. Антыкамінтэрнаўскі пакт. СССР і Ліга Нацый. Грамадзянская вайна ў Іспаніі.

Мюнхенскае пагадненне. Падзел Чэхаславакіі. Спроба стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-французка-англійскія перамовы. Савецка-германскія дагаворы і сакрэтныя пратаколы 1939 г.

### 1.3. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі

Пачатак Другой сусветнай вайны. Напад Германіі на Польшчу. Аб'яўленне Германіі вайны Францыяй і Вялікабрытаніяй. Прычыны і характар вайны.

Уступленне войскаў Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Уз'яднанне Беларусі. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.

Становішча ў заходніх рэгіёнах Савецкага Саюза. СССР і краіны Балтыі. Савецка-фінляндская вайна. Удзел беларусаў у фінскай кампаніі.

### 1.4. Акупацыя Германіяй краін Еўропы

«Дзіўная вайна». Акупацыя Германіяй Даніі, Нарвегіі, Бельгіі, Галандыі і Люксембурга. Наступленне германскіх войскаў у Францыі. Капітуляцыя Францыі. Берлінскі пакт. Агрэсія Германіі на Балканах. Дзейнасць СССР на міжнароднай арэне. Пакт аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй.

Пачатак Руху Супраціўлення. Падрыхтоўка Германіі да вайны з СССР. Прыняцце плана «Барбароса».

### 1.5. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны

СССР у перадваенныя гады. Мерапрыемствы па ўмацаванні абараназдольнасці краіны. Ваенна-патрыятычная і ваенна-абарончая работа сярод насельніцтва.

Узброеныя сілы Савецкага Саюза. Заходняя Асобая ваенная акруга.

## 2. БАРАЦЬБА САВЕЦКАГА НАРОДА СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКАЙ АГРЭСІІ

### 2.1. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны

Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. План «маланкавай вайны». Напад Германіі на СССР. Прыгранічныя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці.

Дзейнасць савецкіх і партыйных органаў па мабілізацыі сіл і сродкаў для барацьбы з агрэсарам. Дзяржаўны камітэт Абароны (ДКА). Перавод прамысловасці на ваенныя рэйкі. Эвакуацыя насельніцтва, матэрыяльных рэсурсаў і іншых каштоўнасцей у тыл СССР.

Знішчальныя атрады і народнае апалчэнне. Баявыя дзеянні на савецка-германскім фронце. Абарончыя баі пад Мінскам, Бабруйскам, Оршай, Віцебскам, Магілёвам, Гомелем. Магілёўская бітва. Гераізм савецкіх воінаў. Дапамога насельніцтва Чырвонай Арміі. Дзейнасць першых партызанскіх атрадаў, дыверсійных груп і падпольных арганізацый. (М.П.Шмыроў, В.З.Корж, І.З.Ізох, І.А.Ярош, М.І.Жукоўскі і інш.). Першыя партызаны – Героі Савецкага Саюза (Ц.П.Бумажкоў, Ф.І.Паўлоўскі).

Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам-восенню 1941 г.

Дзейнасць СССР на міжнароднай арэне. Ваенна-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Савецкім Саюзам Вялікабрытаніяй і ЗША. Пачатак стварэння антыгітлераўскай кааліцыі. Ваенныя дзеянні ў канцы 1941 года. Уступленне ў вайну ЗША і Японіі. Маскоўская бітва. «Віцебскія вароты».

**2.2. Акупацыйны рэжым**

Генеральны план «Ост». Ваенна-эканамічныя мэты захопнікаў. Ваенна-паліцэйскія органы вынішчэння. Тэрытарыяльны падзел акупіраваных заходніх рэгіёнаў СССР. Рэйхскамісарыяты «Остланад» і «Украіна».

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускай акупіраванай тэрыторыі: Генеральная акруга Беларусь, Генеральная акруга Житомір, Генеральная акруга Валынь – Падолія, Генеральная акруга Беласток, Генеральная акруга Літва, вобласць армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Акупацыйны апарат кіравання. Склад і структура. Генеральны камісарыят Беларусі, абласныя і мясцовыя камісарыяты, раённыя і валасныя ўправы. Дапаможныя акупацыйныя органы кіравання.

Палітыка генацыду. Знішчэнне насельніцтва і ваеннапалонных. Злачынная дзейнасць СС, службы бяспекі (СД) германскай палітыкі. Айнзацгрупы і зондэркаманды. Карныя экспедыцыі. Канцэнтрацыйныя лагеры, турмы. Гета. Вываз насельніцтва на прымусовую працу ў Германію. «Остарбайтары». Удзел замежных, мясцовых і іншых ваенна-паліцэйскіх фарміраванняў у генацыдзе мясцовага насельніцтва, ваеннапалонных і яўрэяў.

Ваенна-эканамічныя фарміраванні. Калабарацыянізм. Германская прапаганда і агітацыя: формы і метады. Школа, тэатр, друк, радыё, царква на акупіраванай тэрыторыі. Нацысцкая палітыка міжнацыянальных адносін. Эканамічная палітыка акупацыйных улад. Рабаванне матэрыяльных рэсурсаў і культурных каштоўнасцей. Паўсядзённае жыццё насельніцтва ва ўмовах германскай акупацыі.

**2.3. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі**

Узнікненне, станаўленне і развіццё партызанскага руху. Падпольная барацьба. Дзейнасць партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый ва ўмовах акупацыі.

Стварэнне Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху.

Партызанскія атрады і брыгады. Арганізацыйная структура патрыятычнага супраціўлення.

Баявая дзейнасць партызан. Дыверсіі на чыгунцы і шашэйных дарогах. Рэйкавая вайна і яе мэты. Разгром варожых гарнізонаў. Партызанскія рэйды. Партызанская разведка. Барацьба супраць карных экспедыцый. Узаемадзеянне беларускіх, рускіх, украінскіх, літоўскіх і латышскіх партызан. Роля партызанскага руху ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў.

Узаемаадносіны партызан і насельніцтва. Выратаванне насельніцтва ад знішчэння і прымусовага ўгону ў Германію. Партызанскія зоны. Арганізацыйнае ўмацаванне партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый. Узмацненне антыфашысцкага супраціўлення на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Усенародны характар барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пашырэнне партызанскіх зон. Партызанскія рэзервы. Быт партызан. Прапаганда і агітацыя сярод насельніцтва. Культурна-асветніцкая дзейнасць партызан.

Партыйнае, камсамольскае, антыфашысцкае падполле. Арганізацыйная структура і склад. Формы і метады барацьбы патрыётаў. Камсамольска-маладзёжнае падполле. Дзейнасць падпольшчыкаў Мінска, Магілёва, Гомеля, Брэста, Гродна і іншых гарадоў Беларусі. Дыверсіі на чыгуначных вузлах Оршы, Асіповіч, Калінкавіч, Полацка і інш. Складанасці падпольнай і дыверсійнай барацьбы. Узаемадзеянне падпольшчыкаў і партызан у ходзе барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Антыфашысцкія патрыятычныя групы і арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Армія Краёва і яе формы барацьбы. Супраціўленне ў гета і канцэнтрацыйных лагерах.

Дапамога савецкага тылу і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам.

## 3. РАЗГРОМ ФАШЫСЦКАГА БЛОКА ЗАВЯРШЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВОЙНАЎ

### 3.1. Падзеі на франтах вайны. Крах наступальнай стратэгіі германскага вермахта

Пашырэнне маштабаў Другой сусветнай вайны. Перамогі саюзных войск у Афрыцы, Міжземнамор'і і на Ціхім акіяне.

Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны перелом у вайне. Пачатак распаду фашысцкага блока. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя. Пытанне аб адкрыцці Другога фронту.

### 3.2. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў

Пачатак вызвалення Беларусі. Першы вызвалены раённы цэнтр – Камарын. Вызваленне Гомеля, Рэчыцы. Узаемадзеянне партызан, насельніцтва і войскаў Чырвонай Арміі. Першыя аднаўленчыя мерапрыемствы.

Становішча на савецка-германскім фронце. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. «Рэйкавая вайна».

Акружэнне і разгром германскіх армейскіх груповак пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам і інш. Вызваленне Мінска. Партызанскі парад. Прыклады

гераізму воінаў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў. Выгнанне германскіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі. Вызваленне Брэста. Значэнне разгрому германскіх войскаў у Беларусі. Мерапрыемствы па аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі.

**3.3. Савецкі тыл у гады вайны. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Перамога! Ушанаванне памяці загінуўшых у Беларусі**

Перавод эканомікі на ваенныя рэйкі развіцця. Дзейнасць Камітэта Абароны. Ваенна-прамысловае будаўніцтва на Урале, Сібіры, Сярэдняй Азіі. Усход – асноўная ваенна-прамысловая база СССР. Працоўны подзвіг савецкага народа. «Усё для фронта!» Усё для Перамогі!».

Сацыяльна-эканамічнае, культурнае і духоўнае жыццё савецкага народа. Палітычная агітацыя і прапаганда.

Дзейнасць беларускіх устаноў і арганізацый у тыле (Акадэмія Навук БССР, ВНУ, дзіцячыя дамы і г. д.). Ураджэнцы Беларусі – героі тылу.

Адкрыццё Другога фронту. Вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Еўропу. Падзеі ў Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі. Крымская канферэнцыя. Берлінская аперацыя. Сустрэча на Эльбе. Разгром германскай арміі. Заканчэнне вайны ў Еўропе. Капітуляцыя Германіі, Перамога! Патсдамская канферэнцыя.

Воіны-беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Беларусы ў складзе саюзных армій і Еўрапейскага Руху Супраціўлення.

Манжурская аперацыя войскаў Чырвонай Арміі. Бамбардзіроўка ЗША Херасімы і Нагасакі. Капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны. Вынікі і ўрокі.

Беларусь – адна з краін-заснавальніц ААН. Нюрнбергскі працэс. Уклад беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі. Людскія і матэрыяльныя страты Беларускай ССР. Міжнароднае значэнне Перамогі.

Ушанаванне памяці загінуўшых у Беларусі. Ураджэнцы Беларусі – Героі Савецкага Саюза і поўныя кавалеры ордэна Славы.

Гарады-героі. Мемарыяльныя комплексы: Трэптаў парк (Берлін). Паклонная гара (Масква). Мамаеў курган (Валгаград). Брэсцкая крэпасць-герой. Хатынь. Помнікі – Курган Славы, Трасцянец і інш.

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, краязнаўчыя музеі. Хроніка «Памяць».

## ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (У КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)» ДЛЯ ВОЧНАЙ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

| Нумар раздзела,тэмы | Назва раздзела (тэмы) | Колькасць аўдыторныхгадзін | | | Самастойная праца студэнта | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | КСП | семінары | | |
| 1 | **САВЕЦКІ САЮЗ І КРАІНЫ СВЕТУ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ** | **6** | **2** | **4** | **14** | |
| 1.1 | **УВОДЗІНЫ. МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА НАПЯРЭДАДНІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ**<br>1. Прадмет і задачы вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», яе актуальнасць і значэнне.<br>2. Абвастрэнне супярэчнасцей паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў міжваенны перыяд.<br>3. Спробы стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. | 2 | 0,5 | | 4 | Кантрольнае апытанне, электронны тэст |
| | **МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА НАПЯРЭДАДНІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ПАДЗЕІ Ў БЕЛАРУСІ**<br>1.Абвастрэнне супярэчнасцей паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў міжваенны перыяд. Прычыны вайны.<br>2. Міжнародная палітыка Савецкага Саюза ў міжваенны час (20-30 гг. ХХ ст.)<br>3. Савецка-германскі дагавор 1939 г. і яго сакрэтны пратакол. | | | 2 | | Кантрольнае апытанне, электронны тэст |
| 1.2 | **ПРЫЧЫНЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ПАДЗЕІ Ў БЕЛАРУСІ**<br>1. Нападзенне фашыскай Германіі на Польшчу і пачатак Другой сусветнай вайны.<br>2. Аб’яднанне беларускага народа ў складзе БССР. Пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі.<br>3. Савецка-фінская вайна і ўдзел беларусаў у ёй. | 2 | 0,5 | | 2 | Даклады і паведамленні, рэфераты |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3<br>1.4 | **АКУПАЦЫЯ ГЕРМАНІЯЙ КРАІН ЕЎРОПЫ. СССР НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**<br>1. «Дзіўная вайна». Агрэсія Германіі ў Еўропе і на Балканах.<br>2. Падрыхтоўка Германіі да вайны з СССР.<br>3. Палітычныя і ваенныя дзеянні Савецкага Саюза ва ўмовах пачатку другой сусветнай вайны. | 2 | 1 | | 4 | Даклады і паведамленні, рэфераты |
| | **АКУПАЦЫЯ ГЕРМАНІЯЙ КРАІН ЕЎРОПЫ. СССР НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**<br>1. Нападзенне фашысцкай Германіі на Польшчу і пачатак Другой сусветнай вайны.<br>2. Ваенныя і гаспадарчыя прыгатаванні СССР да вайны.<br>3. Беларусь напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. | | | 2 | 4 | Кантрольнае апытанне, электронны тэст |
| 2 | **БАРАЦЬБА САВЕЦКАГА НАРОДА СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКАЙ АГРЭСІІ** | **6** | **2** | **6** | **14** | |
| 2.1 | **ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**<br>1. Нападзенне фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз.<br>2. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.<br>3. Эвакуацыя насельніцтва, матэрыяльных рэсурсаў і іншых каштоўнасцей у тыл СССР.<br>4. Прычыны паражэння Чырвонай Арміі ў першы перыяд вайны. | 2 | | | 4 | Рэфераты |
| | **ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**<br>1. Нападзенне фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз.<br>2. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.<br>3. Прычыны паражэння Чырвонай Арміі ў першы перыяд вайны.<br>4. Характар і асаблівасці Вялікай Айчыннай вайны. Роль нацыянальна-патрыятычных пачуццяў савецкіх людзей у барацьбе з фашызмам. | | | 2 | | Даклады і паведамленні на семінарах |
| 2.2 | **АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ**<br>1. Асновы акупацыйнай палітыкі на беларускіх землях.<br>2. Тэрытарыяльны падзел Беларусі і ўсталяванне акупацыйнага апарата кіравання.<br>3. Палітыка генацыду на тэрыторыі Беларусі. | 2 | 1 | | 4 | Апытанне, рэфераты, дыскусія |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ**<br>1. Тэрытарыяльны падзел Беларусі і усталяванне акупацыйнага апарата кіравання.<br>2. Палітыка акупацыйных улад у Беларусі ў галіне эканомікі, адукацыі, культуры.<br>3. Палітыка генацыда на тэрыторыі Беларусі.<br>4. Беларускі калабарацыянізм. | | | 2 | | Апытанне, рэфераты, даклады, тэставыя заданні |
| | **МЕДЫЦЫНА У ГАДЫ ВАЙНЫ**<br>1.Арганізацыя медыцынскай дапамогі ў гады вайны.<br>2.Партызанская медыцына. Асаблівасці аказання медыцынскай дапамогі ў партызанскіх атрадах.<br>3.Дзейнасць медыкаў у падполлі.<br>4. Удзел супрацоўнікаў Мінскага медыцынскага інстытута ў падполлі і партызанскім руху. | | | 2 | 4 | Апытанне, рэфераты, даклады, тэставыя заданні, дыскусія, кантрольная работа |
| 2.3 | **ПАРТЫЗАНСКАЯ І ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА НА БЕЛАРУСІ**<br>1. Прычыны і характар партызанскага руху ў Беларусі, этапы фарміравання.<br>2. Формы і метады партызанскай барацьбы.<br>3. Беларускае антыфашысцкае падполле. | 2 | 1 | | 2 | Размова па дадатковых пытаннях, даклады і паведамленні |
| | **ПАРТЫЗАНСКАЯ І ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА НА БЕЛАРУСІ**<br>1. Прычыны і характар развіцця партызанскага руху ў Беларусі, этапы фарміравання.<br>2. Баявыя дзеянні партызан<br>3. Беларускае антыфашысцкае падполле.<br>4. Армія Краёва і характар яе дзеянняў. | | | 2 | | Апытанне, рэфераты, даклады, тэставыя заданні, дыскусія |
| 3 | **РАЗГРОМ ФАШЫСКАГА БЛОКА. ЗАВЯРШЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВОЙНАЎ** | **6** | **2** | **4** | **10** | |
| 3.1 | **ПАДЗЕІ НА ФРАНТАХ ВАЙНЫ. КРАХ НАСТУПАЛЬНАЙ СТРАТЭГІІГЕРМАНСКАГА ВЕРМАХТА**<br>1.Пашырэнне маштабаў Другой сусветнай вайны. Перамогі саюзных войск.<br>2.Карэнны пералом у Вялікай Айчыннай і Другой Сусветнай вайне | 2 | 0,5 | | 2 | Апытванне, рэфераты, дыскусія |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | (Сталінградская і Курская бітвы).<br>3. Савецкі тыл у гады вайны. | | | | | |
| 3.2 | **ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ АД ГЕРМАНСКІХ ЗАХОПНІКАЎ**<br>1. Пачатак вызвалення Беларусі.<br>2. Стратэгічная ваенная аперацыя «Баграціён».Узаемадзеянне Чырвонай Арміі з партызанамі.<br>3. Людскія, матэрыяльныя і духоўныя страты беларускага народа ў вайне.<br>4. Пачатак аднаўлення народнай гаспадаркі. | 2 | 0,5 | | 2 | Рэфераты, даклады, |
| | **ПАДЗЕІ НА ФРАНТАХ ВАЙНЫ. КРАХ НАСТУПАЛЬНАЙ АПЕРАЦЫІ. ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ**<br>1. Першае стратэгічнае паражэнне гітлераўскай Германіі.<br>2. Складванне Антыфашысцкай кааліцыі.<br>3. Карэнны пералом у Вялікай Айчыннай і Другой Сусветнай вайне (Сталінградская і Курская бітвы).<br>4. Савецкі тыл у гады вайны. | | | 2 | | тэставыя заданні, кантрольная работа |
| 3.3 | **ЗАКАНЧЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. ВЫНІКІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ**<br>1. Адкрыццё другога фронта ў Еўропе.<br>2. Вызваленчыя аперацыі Чырвонай Арміі ў Еўропе.<br>3. Заканчэнне Другой сусветнай вайны. | 2 | 1 | | 2 | Апытванне, рэфераты, дыскусія |
| | **ЗАКАНЧЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. ВЫНІКІ ВОЙНАЎ**<br>1. Заканчэнне Другой сусветнай вайны.<br>2. Беларусь – адна з заснавальніц ААН.<br>3. Нюрнбергскі працэс.<br>4. Памяць пра вайну ў Беларусі | | | 2 | 4 | Кантрольнае апытванне, электронны тэст, дыферэнцыраваны залік |
| | **УСЯГО ГАДЗІН** | **18** | **6** | **16** | **38** | |

# ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (У КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)» ДЛЯ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела (тэмы) | Колькасць аўдыторных гадзін | | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінары | |
| 1 | **САВЕЦКІ САЮЗ І КРАІНЫ СВЕТУ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ** | **2** | **2** | |
| 1.1<br>1.2 | **УВОДЗІНЫ. МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА НАПЯРЭДАДНІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. ПРЫЧЫНЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ПАДЗЕІ Ў БЕЛАРУСІ**<br>1. Прадмет і задачы вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», яе актуальнасць і значэнне.<br>2. Спробы стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-германскі дагавор 1939 г. і яго рэалізацыя (сакрэтныя пратаколы)<br>3. Нападзенне фашыскай Германіі на Польшчу і пачатак Другой сусветнай вайны.<br>4. Аб'яднанне беларускага народа ў складзе БССР. Пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі.<br>5. Савецка-фінская вайна і ўдзел беларусаў у ёй. | 2 | | Тэставыя заданні, кантрольная работа |
| 1.4<br>2.1 | **СССР НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ. ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**<br>1.Палітычныя і ваенныя дзеянні Савецкага Саюза ва ўмовах пачатку другой сусветная вайны.<br>2. Беларусь напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.<br>3. Нападзенне фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз<br>4.Эвакуацыя насельніцтва, матэрыяльных рэсурсаў і іншых каштоўнасцей у тыл СССР. | | 2 | Кантрольнае апытанні, электронны тэст, даклады і паведамленні на семінарскіх занятках, рэфераты |
| 2 | **БАРАЦЬБА САВЕЦКАГА НАРОДА СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКАЙ АГРЭСІІ** | **1** | **2** | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3 | **РАЗГРОМ ФАШЫСКАГА БЛОКА. ЗАВЯРШЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВОЙНАЎ** | **1** | | |
| 2.4<br>3.1 | **ПАРТЫЗАНСКАЯ І ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА НА БЕЛАРУСІ. ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ АД ГЕРМАНСКІХ ЗАХОПНІКАЎ**<br>1. Прычыны і характар партызанскага руху ў Беларусі, этапы фарміравання.<br>2. Формы і метады партызанскай і падпольнай барацьбы.<br>3. Беларускае антыфашысцкае падполле.<br>4. Пачатак вызвалення Беларусі.<br>5. Стратэгічная ваенная аперацыя “Баграціён”.Узаемадзеянне Чырвонай Арміі з партызанамі.<br>6. Людскія, матэрыяльныя і духоўныя страты беларускага народа ў вайне.<br>7. Пачатак аднаўлення народнай гаспадаркі. | 2 | | Тэставыя заданні |
| 2.2 | **АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. МЕДЫЦЫНА У ГАДЫ ВАЙНЫ**<br>1. Тэрытарыяльны падзел Беларусі і ўсталяванне акупацыйнага апарата кіравання.<br>2. Палітыка генацыду на тэрыторыі Беларусі.<br>3. Беларускі калабарацыянізм.<br>4. Арганізацыя медыцынскай дапамогі ў гады вайны. | | 2 | Рэфераты, апытване па датах і паняццях, дыскусія<br>Апытванне, рэфераты, даклады, тэставыя заданні, дыскусія, кантрольная работа, дыферэнцыраваны залік |
| | **УСЯГО ГАДЗІН** | **4** | **4** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці // Марзалюк І.А. Каханоўскі А.Г., Гігін В.Ф. і інш. Мн: Адукацыя і выхаванне .—2022 – 447 с.
2. История белорусской государственности : в 5 т. / Национальная академия наук Беларуси, Ин-т истории; [редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) и др.]. – Минск: Бел. навука, 2018–2020. – Т.4.
3.

**Дадатковая:**

1. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А.М.Литвин [и др.]; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. 3-е изд. – Минск, 2020.
2. Геноцид белорусского народа = Genocide of the Belarusian people: информационно-аналитические материалы и документы / под ред. Шведа А.И. Мн. Беларусь – 2022 – 175 с.
3. Долготович, Б.Д. Сыны Беларуси в боях на Курской дуге : для сред, и ст. шк. возраста Мн.:Беларусь – 2022 – 56 с.
4. Криштапович Л., Геращенко А. Священная война. Мн.: Альтиора Форте – 2021 – 256 с.
5. Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх! Кн. 1-2 склад.: А. М. Літвін, А. А. Кры- варот, К. Д. Ганчарэнка ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Беларуская навук – 2022
6. Ніколі не забудзем: аповеды беларускіх дзяцей пра дні Вялікай Айчыннай вайны уклад. Пятро Рунец; аўт. прадм. Мікола Чарняўскі. Мн.: Мастацкая літаратура – 2021 – 255 с.
7. Республика-партизанка. К 75-летию Победы в Великой Отечественной войне. Изд. 2-е, доп. и испр. / отв. ред. С. Л. Кандыбович, В. В. Данилович, О. В. Солопова. – М., 2020.
8. Страна в огне: В 6 кн. / Отв. ред. А. М. Литвин, М. Ю. Мягков. – М., 2011, 2017.

## МЭТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**Час, вызначаны на самастойную працу, можа быць выкарыстаны студэнтамі для:**

падрыхтоўкі да лекцый, семінараў;
падрыхтоўкі да кантрольных апытванняў, тэстаў;
прапрацоўку пытанняў,якія вынесены на самастойнае вывучэнне;
выкананне даследчыцкіх і творчых заданняў;
вывучэнне першакрыніц і дакументаў.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**Асноўныя формы арганізацыі кіруемай самастойнай працай:**

напісанне рэферата і падрыхтоўка прэзентацыі;

выступленне з дакладам;
вывучэнне тэм, якія не выносіліся на лекцыі;
канспектаванне пісмовых крыніц;
складанне тэстаў для правядзення ўзаемакантролю;
складанне дыдактычных матэрыялаў.

**Кантроль кіруемай самастойнай працай ажыццяўляецца ў выглядзе:**
кантрольнай работы;
выніковых заняткаў з правядзеннем вуснага апытвання або тэсціравання;
абмеркавання рэфератаў;
абароны творчых праектаў;
ацэньвання вусных адказаў, паведамленняў, пісьмовых работ;
праверкі рэфератаў, канспекта крыніц і дакументаў;
індывідуальнай размовы.

## Пералік сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для дыягностыкі

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:
**Вусная форма:**
размова па дадатковым пытанням;
суразмова па пытаннях семінара;
даклады і паведамленні на семінарскіх занятках;
апытванне па паняццях і тэрмінах.
**Пісьмовая форма**:
кантрольныя апытанні;
рэфераты;
прэзентацыі.
**Тэхнічная форма:**
электронныя тэсты.

## Метады, якія выкарыстоўваюцца пры навучанні

Лінейны(традыцыйны) метад: лекцыя, семінар.
Актыўны (інтэрактыўны) метад:
праблемна-арыентаванае навучанне PBL (Problem-BasedLearning);
камандна-арыентаванае навучанне TBL (Team-BasedLearning);
навукова-арынтаванае навучанне RBL (Research-Based Learning).

## ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ НАВЫКАЎ

1. Аналіз значных гістарычных падзей (бітваў, асоб, артэфактаў).
2. Характарыстыка перыядаў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.
3. Суаднясенне сацыяльна-палітычных фактараў з факталогіяй падзей вайны.
4. Аргументаванне вялікага ўклада беларускага народа ў Перамогу.

## ТЭМАТЫКА ЛЕКЦЫЙ
## (ВОЧНАЯ ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

1.Уводзіны. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой Сусветнай вайны.

2.Прычыны Другой Сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі.

3.Акупацыя Германіяй краін Еўропы. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

4. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

5. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.

6. Партызанская і падпольная барацьба на Беларусі .

7. Падзеі на франтах вайны. Крах наступальнай стратэгіі германскага вермахта.

8. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў.

9. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны і Другой Сусветнай вайны. Вынікі Другой Сусветнай вайны.

## ТЭМАТЫКА СЕМІНАРАЎ
## (ВОЧНАЯ ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

1. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой Сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі.

2. Акупацыя Германіяй краін Еўропы. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

3.Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

4. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.

5. Медыцына ў гады вайны.

6. Партызанская і падпольная барацьба на Беларусі.

7. Падзеі на франтах. Крах наступальнай аперацыі. Вызваленне Беларусі.

8. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай. Вынікі войнаў.

## ТЭМАТЫКА ЛЕКЦЫЙ (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

1. Уводзіны. Міжнароднае становіча напярэдадні вайны. Прычыны Другой Сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі.

2. Партызанская і падпольная барацьба і вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў.

## ТЭМАТЫКА СЕМІНАРАЎ (ЗАВОЧНАЙ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

1. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

2. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. Медыцына ў гады вайны.

## ТЭМАТЫКА КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ (РЭФЕРАТАЎ) ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ.

1. Супярэчнасці паміж заходнееўрапейскімі краінамі ў міжваенны час.
2. Прыход Гітлера да ўлады і мілітарызацыя Германіі.
3. Роль і места Камуністычнага інтарнацыянала (Камінтэрна) у міжнароднай палітыцы Савецкага Саюза.

4. «Мюнхенскі зговар» і акупацыя Германіяй Чэхаславакіі.
5. Пакт Молатава-Рыбентропа.
6. Уз’яднанне беларускага народа у складзе БССР.
7. Нападзенне нацыскай Германіі на Польшчу і баявыя дзеянні на яе тэрыторыі.
8. Беларусы ў шэрагах польскай арміі ў 1939 годзе.
9. Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і ўсталяванне камуністычнай улады.
10. Пераўтварэнні ў галіне культуры і адукацыі ў Заходняй Беларусі ў перыяд з верасня 1939 г. па чэрвень 1941 г.
11. «Дзіўная вайна» на захадзе і разгром Германіяй заходнееўрапейскіх дзяржаў.
12. Савецка-фінская вайна.
13. Заходняя асобая ваенная акруга напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.
14. Крушэнне германскага плана «маланкавай вайны» (1941 г.)
15. Подзвіг савецкіх памежнікаў у 1941 г.
16. Абарона Брэсцкай крэпасці ў святле новых крыніц у постсавецкай гістарыяграфіі.
17. Савецкая авіацыя у 1941 г.
18. Ідэалагічныя фактарыў вайне паміж Германіяй і СССР.
19. Савецкая эвакуацыя – поспехі і правалы.
20. Тэрытарыяльны падзел Беларусі пад час нацыскай акупацыі.
21. Генацыд на тэрыторыі Беларусі.
22. Беларускія “остарбайтэры”.
23. Карныя аперацыі нацыстаў на Беларусі.
24. Канцлагеры і гета на тэрыторыі Беларусі.
25. Хатынь – сімвал нямецкага генацыда на тэрыторыі Беларусі.
26. Беларускія калабарацыяністы ў 1941-1944 гг.
27. Этапы развіцця і геаграфічныя асаблівасці партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі.
28. Знакамітыя партызанскія аперацыі і дыверсіі на тэрыторыі Беларусі.
29. Партызанская “рэйкавая вайна”.
30. Гісторыя мінскага падполля і знішчэнне мінскімі падпольшчыкамі гаўляйтэра Кубэ.
31. Дзяцінства ва ўмовах вайны.
32. Армія Краёва на тэрыторыі Беларусі.
33. Савецкія партызанскія кіраўнікі ў пасляваенным жыцці (Машэраў, Старавойтаў, Корж).
34. Перабудова службы аховы здароўя.
35. Арганізацыя эвакуацыі параненых. Санітарная дапамога.
36. Подзвіг хірургаў у гады вайны.
37. Роля ленд-лізу у забеспячэнні савецкай службы аховы здароўя медыкаментамі і абсталяваннем.
38. Дасягненні савецкай медыцынскай навукі за гады вайны.

39. Асаблівасці аказання медыцынскай дапамогі ва ўмовах партызанскіх атрадаў.

40. Удзел супрацоўнікаў Мінскага медыцынскага інстытута ў вайне.

41. Бітва за Маскву і першае паражэнне вермахта.

42. Дзейнасць беларускіх устаноў і арганізацый у тыле (Акадэмія навук БССР, ВНУ, тэатры, дзіцячыя дамы і г.д.).

43. Ялцінская канферэнцыя і яе значэнне для лёсу пасляваеннай Еўропы.

44. Патсдамская канферэнцыя.

45. Атамная бамбардыроўка ЗША Хірасімы і Нагасакі.

46. Нюрнбергскі працэс.

47. Беларусь – рэспубліка-заснавальнік ААН.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, зякой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацоўвала вучэбную праграму (дата і нумар пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1.Гісторыя беларускай дзяржаўнасці | Філасофіі і паліталогіі | няма | № 14<br>ад 25.05.2023 |

**СКЛАДАЛЬНІКІ :**

Дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт — Н.А. Поляк

Загадчык кафедры філасофіі і паліталогіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», кандыдат філасоўскіх навук, дацэнт — В.Л. Пазнякова

Змест, афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных дакументаў адпавядае ўстаноўленым патрабаванням.

Дэкан лячэбнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
27.06.2023 — А.І.Валатоўскі

Дэкан педыятрычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
27.06.2023 — А.К.Філіповіч

Дэкан стаматалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
27.06.2023 — Т.Л.Шэвела

Дэкан медыка-прафілактычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
27.06.2023 — А.У. Гіндзюк

Дэкан фармацэўтычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
27.06.2023 — Н.С.Гурына

Метадыст установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
27.06.2023 — Г.П.Пагарэлава